пчалінай гаспадаркай), *Плытнікі* (перапраўлялі лес), *Канюхі* (разводзілі каней), *Стральцы, Мысліўцы* (палявалі на дзікіх звяроў і птушак), *Сакольнікі* (лавілі сокалаў), *Калеснікі* (выраблялі колы), *Берднікі* (бёрды), Чабатары (шылі боты). Адлюстроўваліся назвы старажытных майстэрняў і прадпрыемстваў, якія з'яўляліся прыналежнасцю да гаспадарскіх двароў: *Бровар* (вінакурны завод), *Плітніца* (майстэрня па вырабу пліт), *Тартак* (лесапільны завод), *Гарбарня* (скураны завод), *Цагельня* (цагельны завод), *Гута* (шкляны завод).

На тэрыторыі Беларусі шмат назваў пасяленняў, зыходнымі для каторых паслужылі асабовыя імёны, мянушкі і прозвішчы людзей. У княжацкі перыяд гарады-крэпасці атрымалі свае назвы ад імёнаў князёў. Так, мяркуецца, што адзін з найстаражытнейшых гарадоў беларускай зямлі *Тураў* названы ў гонар першага летапіснага князя Тура, *Барысаў* – у гонар князя Барыса Глебавіча. Айканімія засведчыла рад наступных імёнаў і прозвішчаў земляробаў: *Грынькова, Дабрынёва, Захараўка, Карпушоўка, Мікалаеўшчына.*

Кожная гістарычная назва з'яўляецца помнікам народнага менталітэту. Таму, як і помнікі матэрыяльнай культуры, яны патрабуюць рэстаўрацыі. "Гістарычныя назвы, – сказаў Д.С.Ліхачоў, – гэта культураўтвараючыя сувязі паміж мінулым, цяперашнім і будучым".

Даследаванне дадзенага пытання – гэта не толькі тэма даследчай работы, якая найбольш блізкая для нас, але і неабходныя веды для кожнага жыхара нашай краіны. Бо пакуль мы ведаем нашу гісторыю, захоўваем нашы традыцыі, паважаем сваю культуру, мы ўпэўнены ў сваім паўнацэнным гарманічным развіцці і будучыні.

# МАРАЛЬНА-ЭСТЭТЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ ДЗЕЙНАСЦІ ЛІТАРАТУРНАГА АБ'ЯДНАННЯ "ЗОРЫ НАД ЗЯЛЬВЯНКАЙ"

УА "Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт"
**Мацюк Ксенія Іванаўна, 1 к., 21 гр., ЛФ**
Кафедра рускай і беларускай моў
Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Варанец В.І.

Літаратурныя аб'яднанні і гурткі ва ўсе часы з'яўляліся паказчыкамі літаратурнага жыцця, а ў некаторыя эпохі – не столькі літаратурнага, колькі літаратурна-грамадскага. ЛітА – гэта творчая лабараторыя мастацтва, якая дае магчымасць зносінаў і падтрымкі, адкрывае новыя імёны і дае пуцёўку ў жыццё будучым літаратарам. Не ўсе з іх, вядома, стануць знакамітымі паэтамі, празаікамі,



Репозиторий ГрГМУ

драматургамі, крытыкамі. “Вялікімі” становяцца адзінкі.

Але ж менавіта ў гэтым асяроддзі фарміруюцца майстры мастацкага слова, якія (прызнана даследчыкамі) з’яўляюцца носьбітамі культуры слова і праваднікамі маральных каштоўнасцяў.

Менавіта таму мэтай працы з’яўляецца збор матэрыялу аб дзейнасці літаратурнага аб’яднання “Зоры над Зальвянкай”, аналіз яго патэнцыялу ў плане выхавання падлеткаў і моладзі. Актуальнасць і навізна працы ў тым, што дадзеная тэма сур’ёзна не распрацоўвалася ні гісторыкамі, ні літаратуразнаўцамі і з’яўляецца запатрабаванай сёння ў разрэзе літаратурнай спадчыны Зельвеншчына.

Пачатак ***сістэматычнай*** дзейнасці літаратурных аб’яднанняў на Беларусі патрэбна адлічваць з 20 – х гадоў XX ст., калі маладая савецкая краіна пачала праводзіць палітыку беларусізацыя. У канцы 1923 г. з’явілася літаратурнае аб'яднанне ***«Маладняк»***, якое лічыла сябе арганізацыяй пралетарскіх пісьменнікаў. У 1926 г. група пісьменнікаў і паэтаў выйшла з «Маладняка» і стварыла новае літаратурнае аб'яднанне ***«Узвышша»***. У 1927 г. сфармавалася літаратурнае аб'яднанне ***«Полымя»***. У яго ўвайшлі пераважна пісьменнікі старэйшага і сярэдняга пакалення. Сярод іх былі Я. Колас, Я. Купала, А. Аляксандровіч, Ц. Гартны, А. Дудар, М. Чарот.

Дакладную дату стварэння літаратурнага аб’яднання “Зоры над Зальвянкай” назваць складана. Справа ў тым, што ўсё пачыналася проста з сяброўскіх сустрэч людзей, у якіх было агульнае захапленне –родная мова і паэзія. Зачынальнікам гэтай справы стала рэдкалегія раённай газеты “Праца”. Менавіта вакол гэтага выдання сфарміравалася вядомае ў Гродзенскай вобласці літаратурнае аб’яднанне “Зоры над Зальвянкай”. Калі абапірацца на сведчанні яго першага кіраўніка – Пятра Марціноўскага, то аб’яднанне акрэслілася як паўнавартасная арганізацыя ў 70-х гг. мінулага стагоддзя [1, с. 3].

Пачынаючы з 1973 г. П.М. Марціноўскі з’яўляўся кіраўніком літаратурнага аб’яднання пры раённай газеце “Праца”. Па ўспамінах старэйшых членаў ЛітА, стаць на чале пісьменніцкага аб’яднання Пятру Марціноўскаму прапанавала тагачасны рэдактар газеты Ірына Васілеўка. Не апошнюю ролю ў гэтым, відаць, сыгралі выдатныя арганізатарскія здольнасці Пятра Мікалаевіча, яго адказанасць, а таксама гасціннасць і ўменне гаварыць з простымі людзьмі на адной мове.

Пётр Марціноўскі больш за трыццаць гадоў запальваў зоры. Ён рыхтаваў вершы да друку, наладжваў літаратурныя сустрэчы, вечары. Быў перакананы, што паэт не толькі той, хто піша вершы, але і той, хто іх любіць і чакае выхаду старонкі “Зораў над Зальвянкай”. Гэтую літстаронку “адкрыў” першым менавіта Марціноўскі. З яго лёгкай рукі ў “Працы” сталі сістэматычна друкавацца мясцовыя пісьменнікі, як Юрка Голуб, Уладзімір Мазго, Міхась Скобла.



Рэпазіторый ГрГМУ

Па запрашэнню Пятра Мікалаевіча Зэльвеншчыну ў свой час наведалі многія слынныя беларускія пісьменнікі, у тым ліку В. Быкаў, А. Карпюк, А. Лойка, А. Асіпенка. Усіх не пералічыць. У доме Пятра Марціноўскага пабывала шмат вядомых мастакоў, журналістаў, музыкантаў. Але часцей за іншых у Дзярэчын прыязджалі землякі – Павел Сцяцко, Міхась Скобла, Юрка Голуб, Уладзімір Ягоўдзік, Валянцін Дубатоўка. А ў прыватнай бібліятэцы гаспадара засталіся кнігі з аўтографамі М. Танка, Я. Брыля, Н. Гілевіча, Д. Бічэль, С. Законнікава – ці не паловы прадстаўнікоў СБП.

Пасля смерці Пятра Марціноўскага паўстала пытанне: каму ж кіраваць аб'яднаннем, хто здольны падтрымліваць на высокім узроўні яго дзейнасць, не згубіць таго, што назапашана, і рухацца наперад? У членаў ЛітА не было сумненняў: такім чалавекам з'яўляецца Яніна Шматко, адна са старэйшых у літаб'яднанні, былы бібліятэкар СШ № 2 г.п. Зэльва. Але выбар быў зроблены не таму, што Яніна Людвікаўна даўно сярод "заран". Як і ў выпадку з Пятром Марціноўскім, члены "Зор" ведалі: яна многа зрабіла для папулярызацыі аб'яднання, і былі ўпэўнены, што зробіць яшчэ больш. Яны не памыліліся. З 2006 г. Яніна Шматко становіцца кіраўніком "Зор".

Перш за ўсё Яніна Шматко спрыяе адкрыццю новых імёнаў. Па яе ініцыятыве на старонках газеты з'явілася рубрыка "Дэбют", дзе друкуюцца творы маладых пісьменнікаў. Акрамя таго яна асабіста дапамагае пачынаючым паэтам: выступае як рэдактар іх твораў, дасылае вершы і прозу масцітым паэтам-землякам для рэцэнзіі.

Своеасаблівай справаздачай "Зор" стаў доўгачаканы зборнік паэзіі, падрыхтаваны да выдання яшчэ Пятром Марціноўскім. Але пабачыў ён свет толькі ў юбілейны для Зэльвы 2008 г., дзякуючы падтрымцы Зэльвенскага райвыканкама. На старонках гэтай кнігі, якая мае аднайменную з аб'яднаннем назву, надрукаваны вершы як дзеючых, так і былых "заран". Прадмова да зборніка напісана Пятром Марціноўскім. Пададзены кароткія біяграфічныя звесткі аб аўтарах, іх фота. У зборніку змешчаны выключна беларускамоўныя творы, пераважная большасць якіх пра родны край.

Сёння "Зоры над Зальвянкай" налічваюць 20 паўнавартасных членаў. Гэта настаўнікі і школьнікі, бібліятэкары і медработнікі, якіх натхнілі на творчасць маляўнічыя зэльвенскія краявіды і самыя светлыя чалавечыя пачуцці. Як бачым, літаратурнае жыццё нашай краіны багатае і разнастайнае. І літаб'яднанне "Зоры над Зальвянкай" займае ў ім не апошняе месца.

**Спіс літататуры:**

1. Зоры на Зальвянкай: зборнік вершаў/ літ. аб'яднанне "Зоры над Зальвянкай". – Слонім: Слонім. друк., 2008. – 140 с.

2. Кароза, А. "Сярод тых, хто жыве на Зямлі..." / А. Кароза // Праца. – 2006. – 11 сак. – С. 9.



Рэпазіторый ГрДМУ